*Учащиеся работают с раздаточными карточками, затем с опорой на изображение на экране проверяют задание (слайд 5).*

**III. Организационно-деятельностный этап.**

**Учитель.** Jetzt fragt sich gegenseitig! Bildet Dialoge. Spielt im Paar.

*Учащиеся работают в парах, задают друг другу вопросы о летних каникулах.*

Wo warst du in den Ferien?

Wie waren deine Ferien?

Was hast du in den Ferien gemacht?

**IV. Рефлексивно-оценочный этап.**

4.1. Подведение итогов урока.

Учитель. Heute habt ihr viel gemacht. Ihr habt sehr gut gearbeitet und ich hoffe, dass diese Stunde euch gefallen hat. Schickt SMS den Freunden, wie die Stunde war. Benutzt die Tabelle.

| **Ich lerne Deutsch ___** | **Ich habe _____ gearbeitet** | **Die Deutschstunde war_** |
|---|---|---|
| gern – fleißig – nicht gern – schlecht – nicht besonders gut | viel – fleißig – wenig – schlecht – prima – gut | super – interessant – nicht besonders interessant – langweilig |

*Учащиеся пишут сообщения на бумажных сотовых телефонах.*

4.2. Предъявление и объяснение домашнего задания.

**Учитель.** Zu Hause arbeitet ihr auch in den Gruppen. Macht das Projekt von der Seite 44 und präsentiert euer Projekt wie ein Dialog in der Klasse.

4.3. Выставление и комментирование отметок.

Приложение

**QR-код доступа к презентации**

**QR-код доступа к раздаточным материалам**

**QR-код доступа к карточкам с опорными словами**

*Дата поступления в редакцию: 02.03.2025*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” Ў ХІ КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ГЕОРГІЙ МАРЧУК. НАВЕЛЫ “КАНОН ГАРЫНІ”, “КАНОН МАЦІ”

*Муцюк Наталля Іванаўна*

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні будуць ведаць некалькі фактаў з біяграфіі пісьменніка; на прыкладзе вывучэння выбраных твораў зразумеюць адметнасць творчасці пісьменніка; атрымаюць уяўленне пра жанрава-стылёвую спецыфіку яго твораў; паглыбяць веды пра апавяданне і навелу як жанр.

**Задачы:**

стварыць ўмовы для ўсведамлення значнасці вывучаемага матэрыялу;

працягваць развіваць навыкі, якія фарміруюць чытацкую пісьменнасць;

развіваць уменне працаваць са зместам мастацкага твора;

садзейнічаць выхаванню патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, паважлівых адносін да малой радзімы.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялф.

**Абсталяванне:** партрэт пісьменніка, эпіграф[1], вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 11 класа, творы Г. Марчука, карта Беларусі, фотаздымак Давыд-Гарадка,тлумачальны слоўнік беларускай мовы, відэаролік «Давыд-гарадоцкія каноны», канверты з афарызмамі.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны этап.**

*Стварэнне псіхалагічнага настрою.*

Калі сёння правесці апытанне сярод жыхароў Беларусі і папрасіць назваць імёны дзесяці беларускіх

[1]“Я ніколі не чакаю і не шукаю натхнення: / любоў да радзімы маё натхненне”. (Г. Марчук).

пісьменнікаў, то наўрад ці імя Георгія Марчука будзе ў гэтым спісе. А між іншым, творы Г. Марчука двойчы намініраваліся на Нобелеўскую прэмію. Для нас гэта сенсацыя. Сёння на ўроку мы павінны спасцігнуць прыроду гэта сенсацыі.

*Зварот да эпіграфа.*

Кожны чалавек павінен старацца праславіць тое месца, дзе ён нарадзіўся. Георгій Марчук можа быць узорам у гэтым.

**II. Падрыхтоўка да працы на асноўным этапе.**

2.1. Праца з тэкстам[2].

Гэтая прыгожая легенда з кнігі знакамітага ўраджэнца Давыд-Гарадка Міхаіла Шэлегава, вядомага беларускага краязнаўцы. Прачытайце яе і выканайце заданні да тэксту.

*Дзесяць лоддзяў плылі па рацэ. Мерна падымаліся і апускаліся вёслы, паскрыпвалі ўключыны. На пярэдняй ладдзі выдзялялася велічная постаць віцязя з непакрытай галавой, сівымі валасамі і барадой. Гэта быў князь Давыд, унук знакамітага кіеўскага князя Яраслава Мудрага. У пошуках лепшай долі ён адправіўся ў вандроўку па Прыпяці, каб заснаваць свой горад. Неўзабаве шлях лоддзяў Давыда скіраваўся на адзін з прытокаў буйной палескай "артэрыі" – ракі Гарынь. Князю кінуўся ў вочы бераг прасторнага пагорка.*

"*Тут будзе горад Давыдаў! І я буду першым князем Гарадзецкім*" – *усклікнуў князь, прыпыніўшы свой выбар. І быў гэта 1100 год ад ражаства Хрыстова...*

Заданні да тэксту:

На якой рацэ знаходзіцца горад Давыд-Гарадок?

Прытокам якой ракі з'яўляецца гэта рака?

Разгледзьце выявы гербаў некалькіх беларускіх гарадоў, знадзіце сярод іх герб Давыд-гарадка (дадатак).

Знадзіце і зачытаце сказ (сказы), які дапамог вам знайсці герб горада.

Якія рэальныя гістарычныя факты сустракаюцца ў легендзе?

2.2. Праца з картай Беларусі[3] (дадатак).

Заданні:

Знайдзіце на карце горад Давыд-Гарадок. Разгледзьце фотаздымак горада.

Раскажыце аб геаграфічным размяшчэнні Давыд-Гарадка, коратка ахарактарызуйце асаблівасці гэтага рэгіёну.

Давыд-гарадоцкую зямлю яшчэ наш класік Уладзімір Караткевіч у сваіх падарожных замалёўках называў "Палескай Венецыяй". Ці можна пагадзіцца са словамі У. Караткевіча? Чаму?

2.3. Паведамленне тэмы ўрока.Фармулёўка задач.

*Выкарыстоўваючы дзеясловы, запісаныя на дошцы, вучні фармуліруюць задачы, над вырашэннем якіх будуць працаваць на ўроку.*

Буду ведаць...

Змагу...

Навучуся...

Пазнаёмлюся...

**III. Засваенне новых ведаў і спосабаў дзейнасці.**

3.1. Знаёмства з асноўнымі звесткамі пра жыццё і творчасць Г.Марчука.

Праца ў групах з вучэбным дапаможнікам па беларускай літаратуры[4].

Група 1 працуе з біяграфіяй пісьменніка (с. 168–169).

Група 2 аналізуе інфармацыю па творчасці пісьменніка (с. 169—170).

Заданне групам: запішыце ў рабочыя сшыткі і агучце па 5 цікавых фактаў з біяграфіі і творчасці Георгія Марчука, якія павінен ведаць кожны беларус.

3.2. Прэзентацыя вынікаў работы груп.

<u>Прыкладны адказ:</u>

1. Нарадзіўся Георгій Васільевіч Марчук 1 студзеня 1947 у г. Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.
2. Выхоўвалі дзядуля Зміцер і бабуля Наста.
3. У 1973 г. скончыў завочнае аддзяленне па спецыяльнасці тэатразнаўства Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.
4. З 1980 г. — кінарэжысёр на кінастудыі "Беларусьфільм".
5. Займаў пасаду сакратара Саюза пісьменнікаў Беларусі.
6. Аўтар 8 раманаў, 100 навел, 60 казак, 500 афарызмаў і каля 50 п'ес для дзяцей і дарослых.
7. Пачатак творчасці — напісанне п'ес-аднаактовак, якія пазней увайшлі ў зборнік "Ад поўначы да світання".
8. Асноўны матыў творчасці — тэма роднага краю, яго гісторыі і сучаснасці.
9. Георгій Марчук вядомы як сцэнарыст і рэжысёр. Па яго сцэнарыях зняты фільмы "Кветкі правінцыі", "Ліст да Феліні", "Яблык Месяца".
10. У 2003 годзе выдаў кнігу "Урсула", у якой змясціў навелы кахання і "Давыд-гарадоцкія каноны".

На жаль, у жніўні 2023 года Георгія Васільевіча не стала. Да апошняга моманту свае творы ён пісаў шарыкавай ручкай у вучнёўскім сшытку. Ён лічыў, што манітор камп'ютара не мае душы, а ад паперы вее цеплынёй.

*Псіхалагічная паўза:* гучыць песня "Давыд-гарадоцкая калыханка" на словы Л. Дранько-Майсюка, земляка Г. Марчука[5].

3.3. Праца над зместам "Давыд-гарадоцкіх канонаў".

*Настаўнік арганізуе працу ў парах:*

*– праца з артыкулам вучэбнага дапаможніка па тэорыі літаратуры (с. 174). Даць адказ на пытанне: чым навела адрозніваецца ад апавядання.*

*– праца з тлумачальным слоўнікам. Лексічнае значэнне слова «канон».*

[2]Тэкст у кожнага вучня на стале.
[3]Карта і фотаздымак у кожнага вучня на стале.
[4]Вучні дзеляцца на 2 групы.
[5]Песню пад акампанемент гітары выконвае папярэдне падрыхтаваны вучань.

Што такое каноны? Гэта правілы для кіраўніцтва ў царкоўным жыцці хрысціян. "Давыд-гарадоцкія каноны" Г. Марчука — найперш правілы духоўнага, маральна-этычнага жыцця гарадчукоў, іх унутранае крэда, сістэма паводзінаў і ўзаемаадносінаў у грамадстве, стаўленне да навакольнага свету.

Цыкл "Давыд-гарадоцкія каноны" складаецца з 10 навел. Паглядзіце на адрасатаў гэтых канонаў. (Звяртаецца ўвага вучняў на дошку, дзе запісаны назвы ўсіх 10 навел у адвольным парадку).

Мастак слова піша каноны Богу, Гарыні, Хаце, Вуліцы, Агароду, Школе, Ветру, Базару, Часу, Маці. Пісьменнік размясціў іх адна за адной не хаатычна.

*Заданне вучням (індывідуальнае):*

Як бы вы размясцілі навелы ? У якой паслядоўнасці?

Давайце звернем увагу на першую і на апошнюю. Выберыце, якую вы размесціце першай, якую апошняй і чаму?

Параўнанне з аўтарскім варыянтам.

*Настаўнік падсумоўвае, звяртае ўвагу на жыццёвыя прыярытэты.*

*Праца ў парах.*

Заданне парам.

Мы не знаёміліся са зместам усіх канонаў. Ведаем толькі іх назвы. Перад вамі цытаты з усіх 10 канонаў. Суаднясці цытаты з назвамі навел[6].

| НАЗВА | ЦЫТАТА |
|---|---|
| Канон Богу | "Нацельны крыжык і іконка — самыя дарагія святыні, якія ахоўваюць і цела, і душу". |
| Канон Гарыні | "Яна не пачакае, забярэ і знясе і твае гады". |
| Канон Хаце | "У ёй карэнні, пачатак культуры, гаспадарлівасці, густу, чысціні, чалавечага цяпла". |
| Канон Вуліцы | "Вулічныя мянушкі ніякімі ганаровымі званнямі і высокімі пасадамі не вытравіць". |
| Канон Агароду | "Пашлі, Госпадзі, дождык, каб кветкі не згарэлі". |
| Канон Школе | "Ад званка да выпускнога адзін крок". |
| Канон Ветру | "Так хочацца, каб і тваю кашулю ён напоўніў і ператварыў яе ў ветразь". |
| Канон Базару | "Старыя ідуць, каб падтрымаць завядзёнку-традыцыю", "Не ходзяць туды толькі хворыя". |
| Канон Часу | "Не лезь папярод бацькі ў пекла. Прыйдзе час, і ты сам уцямніш, што ты любіш і што не любіш". |
| Канон Маці | "Калі б ты прыйшла на некалькі хвілін адтуль, адкуль ніхто не вяртаецца". |

**IV. Прымяненне ведаў і спосабаў дзейнасці.**

*4.1. Дома вучні прачыталі дзве навелы "Канон Гарыні" і "Канон Маці". Настаўнік арганізуе працу над зместам навел у форме эўрыстычнай гутаркі.*

<u>Пытанні для аналізу "Канона Гарыні".</u>

Якую ролю ў жыцці гарадчукоў займае Гарынь?

Як адносіцца аўтар да ракі свайго дзяцінства? Чым тлумачацца такія адносіны?

Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў пісьменнік стварае характар ракі?

Якія тыповыя рысы гарадчукоў увасоблены ў вобразе рыбака?

Вызначце сімвалічны сэнс вобраза Гарыні ў навеле.

<u>Пытанні для аналізу "Канона Маці".</u>

Чаму цыкл навел заканчваецца "Канонам Маці"?

Падзяліце навелу на сэнсавыя часткі, дайце ім назву.

Ахарактарызуйце вобраз сына.

Звярніце ўвагу на запавет. Як ён характарызуе героя твора?

У чым бачыць пісьменнік сэнс жыцця? Выкажыце свае адносіны да аўтарскай пазіцыі.

*4.2. Да ўрока вучням па жаданні трэба было намаляваць вокладку да "Канона Маці" і да "Канона Гарыні"[7].*

**V. Замацаванне ведаў і спосабаў дзейнасці.**

5.1. Дапоўніце сказы:

Асноўная тэма твораў Г.Марчука…

Пісьменнік працуе ў такіх літаратурных жанрах як…

Любімае месца на планеце для аўтара…

5.2. Калі б вам патрэбна было стварыць «воблака слоў» з «Канона Маці», якія словы вы б туды ўключылі?

5.3. Прагляд урыўка з фільма "Давыд-гарадоцкія каноны" (дадатак).

На XXII фестывалі дакументальнага кіно фільм "Давыд-гарадоцкія каноны" маладога рэжысёра Аляксандры Шпартавай атрымаў вышэйшую ўзнагароду.

Заданне: пасля прагляду зрабіць кароткую рэкламу фільму.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

**VII. Інфармаванне пра дамашняе заданне.**

7.1. Падрыхтаваць свой варыянт "Канона Маці".

7.2.Прачытаць п'есу А. Дударава "Князь Вітаўт".

**VIII. Рэфлексія.**

Мне хочацца сёння падзякаваць Г. Марчуку за тое, што…

*Напрыканцы ўрока кожны вучань атрымлівае ад настаўніка канверт з афарызмам-пажаданнем Георгія Марчука.*

[6] Дэманструецца правільны варыянт.

[7] Якраз на гэтым этапе ўрока будзе мэтазгодным прадэманстраваць вынікі работы, таму што вучні ўжо асэнсавалі ідэйны змест навел і змогуць ацаніць творчасць аднакласнікаў.

Дадатак

**QR-код доступу да матэрыялаў**

**Выявы гербаў некалькіх беларускіх гарадоў**







**Карта Беларусі і фотаздымак Давыд-Гарадка з вышыні птушынага палёту**





**Афарызмы Георгія Марчука**

Калі ты патрэбны хоць аднаму чалавеку, можаш лічыць сябе шчаслівым.

Шмат хто і харошы, і добры, калі гэта яму неабходна.

Нічога так не ўзнімае дух, як нечакана знойдзены на вуліцы рубель.

Старасць не радасць, аднак усім хочацца дажыць.

Грэх пісаць у дзённіках адмоўна пра людзей, якія памерлі. Яны не могуць сябе абараніць.

Калі бачыш, што нічым значным не застаешся ў гісторыі, адшукай хоць бы аднаго вялікага, які нарадзіўся з табой у адзін дзень, і тым суцяшайся.

Для аднаго чалавека набытак — шчасце, для іншага страта — шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і што страчвае.

Пытаеш, якая розніца паміж хітрым і разумным? Хітры на адзін раз. Разумны назаўсёды.

Патрыятызм — гэта ўпрыгожванне Радзімы талентамі і справамі.

Калі мужчына страчвае цікавасць у барацьбе за жанчыну, ён пачынае змагацца за месца ў гісторыі.

Новы гальштук не ўпрыгожыць стары касцюм.

*Дата поступления в редакцию: 03.03.2025*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ ЗАНЯТИЯ ПО ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ОБЛАСТИ «РЕБЕНОК И ОБЩЕСТВО» ДЛЯ ДЕТЕЙ СТАРШЕЙ ГРУППЫ ПО ТЕМЕ «ПРОМЫШЛЕННЫЕ ПРЕДПРИЯТИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

*Жарова Наталья Геннадьевна*

**Задачи:**

формировать представления воспитанников об известных промышленных предприятиях страны и их продукции;

развивать умение составлять небольшой описательный рассказ (рекламу) об этих предприятиях;

воспитывать уважение к людям разных профессий, результатам их труда, гордость за свою страну.

**Материал и оборудование:** презентация, иллюстрации предприятий и их логотипы, предметные картинки с изображением продукции предприятий, мольберты, схемы для составления описательных рассказов, набор конструктора, схемы для изготовления изделий, коробки, этикетки.